звесткі падаваліся крыху шырэй, але па-ранейшаму яшчэ захоўваліся абавязковыя заклікі да расправы з крывавым ворагам, да ўдзелу ў змаганні і ў выкананні ўсіх магчымых абавязкаў, якія бралі на сябе калгаснікі ўжо вызваленых тэрыторый: «Добра разумеючы важнасць грашовых сродкаў у аднаўленні народнай гаспадаркі і далейшым працвітанні нашай Айчыны, мы падпісаліся на Чацвёртую Дзяржаўную Ваенную пазыку на 7.300 рублёў і наш калгас падпісаўся на 1.500 рублёў».

У.С. Саўчанка, БДЭУ

## ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ, ПАДЗЯКІ, ВІНШАВАЛЬНЫЯ ЛІСТЫ, УРУЧАНЫЯ САВЕЦКІМ ВОІНАМ У 1944–1946 ГАДЫ

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны немалаважнае значэнне мела маральная падтрымка баявога духу салдат Чырвонай Арміі. Зразумелая справа, што тут шмат засталося яшчэ ад традыцый перыяду Грамадзянскай вайны, калі таксама любым чынам імкнуліся вылучыць найлепшых. Таму Ганаровыя граматы і падзякі былі прыроўнены да ордэнаў і медалёў, толькі што за іх не былі прадугледжаны грашовыя выплаты.

Найбольш часта папяровыя знакі ўдзелу ў правядзенні канкрэтных баявых аперацый, у ваенным будаўніцтве, у прамысловым працэсе ваенных гадоў пачалі ўручаць ў 1944 годзе, калі вайна ўжо ішла ў Еўропе. Яны ўяўлялі сабою звычайныя агіткі савецкага перыяду. Зверху, у левым ці правым куце, абавязковая выява Сталіна, нярэдка яна змяшчалася на сцягу, які развяваўся над суровымі воінамі і баявымі машынамі. Пад выявай можна было прачытаць традыцыйнае: «За нашу Савецкую Радзіму!» Далей ішоў тэкст, у якім паведамлялася, за ўдзел у якой баявой аперацыі і ад якога канкрэтна чысла ўзнагароджваўся граматай пэўны чырвонаармеец. Даволі часта гэта было дубліраванне загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага аб вынясенні падзякі вайсковаму злучэнню, а ўжо камандзір апошняга ад сябе ганараваў сваіх падначаленых. Законнай такая папера была тады, калі на ёй прысутнічала пячатка і подпіс камандзіра. Праўда, сустракаюцца і толькі з пячаткай.

Дакументы такога кшталту маглі быць чырвонага, зялёнага, сіняга колеру. Часта іх выпускалі ў франтавых друкарнях і, што самае галоўнае, кожнае падраздзяленне магло замаўляць свой наклад, унёсшы пры гэтым нейкія карэктывы ў афармленне, якое найбольш падыходзіла іхняму роду войскаў. Нам сустрэўся толькі адзін бланк з выявай двух правадыроў - Леніна і Сталіна і два ўвогуле без партрэтаў, затое значна «ўзмоцненыя» мастацкім афармленнем, што выгадна вылучала іх сярод іншых. Такія папяровыя ўзнагароды можна было смела назваць мастацкімі знаходкамі.

Даволі часта ў аднаго і таго ж салдата магло быць некалькі аднолькавых бланкаў грамат ці падзяк, толькі з упісанымі туды рознымі назвамі вайсковых

аперацый, датаў і населеных пунктаў. У нечым гэтыя бланкі маглі быць па-сапраўднаму наіўнымі. Маецца на ўвазе адлюстраванне ўсемагчымай зброі, сцягоў, лозунгаў і заклікаў. Тым не менеи, у час вядзення ваенных дзеянняў такая форма ўзнагарод мела свой станоўчы ідэалагічна-палітычны падтэкст.

И.А. Шарко, А.А. Павлючик, БГЭУ

## ФИЛОСОФИЯ ДВОЙНОЙ ЖИЗНИ. ИГРА НАД ПРОПАСТЬЮ

*«...Несчастное сознание, пребывающее в абсолютной разорванности.»*
Г. В. Ф. Гегель

В этом году исполняется 70 лет Великой Победы над нацизмом. И мы не перестаём восхищаться мужеством и храбростью, отвагой и самопожертвованием тех, кто отдал свои жизни за наше мирное небо, но порой забываем, что судьба Великой Отечественной войны, будущее мира решались не только на поле боя. Немаловажную роль сыграли бойцы невидимого фронта, герои-одиночки, сражавшиеся в тылу врага. Разведчики… Какой мальчишка в детстве не мечтал побывать на месте шпиона, почувствовать столь притягательную романтику приключений и благородного риска?! Стереотипы, клише всемогущего агента, навеянные фильмами, литературой, СМИ и прочими не всегда достоверными источниками информации, создали неверное представление о жизни разведчиков.

Тема нашей работы является весьма объемной. Мы не собираемся детально углубляться в метафизику разведки, лишь кратко коснемся некоторых, наиболее важных, по-нашему мнению, аспектов.

Один из древних кодексов гласит: «Воин никогда не выставляет себя на первый план, он не говорит о себе. Это позволяет ему быть непредсказуемым». Разведчик выше простого обывателя, он каждую минуту работает над собой и умеет то, что непостижимо абсолютному большинству. Он осознанно управляет людьми и ситуацией, подобно кукловоду в театральной постановке. А может незаметно и сам стать марионеткой в чужих руках. Тонкая, филигранная игра требует особого мастерства и навыков.

Проявлять ненависть к врагу открыто – легко, гораздо сложнее создавать маску благосклонности на лице, когда в душе кипит гнев и отвращение. С этим разведчик сталкивается ежедневно. Жизнь для него есть беспрерывный спектакль.

Постоянно находясь под прикрытием, живя под вымышленным образом, разведчик может упустить ту границу, когда легенда обретает материальную сущность, обрастая плотью. Время создает барьеры для восприятия

БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by